прыдатнай для навукоўцаў, якія не з’яўляюцца спецыялістамі ў літаратуразнаўстве: гендаролагаў, культуролагаў, мастацтвазнаўцаў.

Даная тыпалогія карэлюе з тэарэтычнымі падыходамі да стратыфікацыі вобразаў-персанажаў, пры гэтым дазваляе пазбегнуць некаторых складанасцей, якія могуць з’явіцца пры звароце да тыпалогій, што традыцыйна выкарыстоўваюцца ў літаратуразнаўстве. Так, агульнавядомай з’яўляецца праблема размежавання вобразаў-характараў і вобразаў-тыпаў – у першую чаргу ў сувязі з адрозненнямі ў вызначэннях гэтых тэрмінаў у даведачнай літаратуры, тэарэтычных працах. У нашым выпадку вобразы-характары, вобразы-тыпы і нават другасныя персанажы аб’ядноўваюцца ў адну групу (як гэта адбываецца ў многіх практычных даследаваннях), бо незалежна ад ступені індывідуалізацыі з’яўляюцца вынікам своеасаблівага мастацкага даследавання рэчаіснасці.

Такім чынам, прапанаваная тыпалогія, распрацаваная на аснове вызначэння **асноўнай мастацкай функцыі** персанажаў, дазваляе супаставіць вобразы-персанажы розных празаічных жанраў у сінхраніі і дыяхраніі, як у сацыякультурным кантэксце, так і ў кантэксце літаратурнай традыцыі, і прасачыць, якія жаночыя вобразы набывалі ці страчвалі актуальнасць у пэўны перыяд.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Литература и язык. Современная иллюстрированная энциклопедия / под ред. А. П. Горкина. М. : Росмэн, 2006. 1683 с.

2. Чарнавокая, А. Прынцыпы тыпалагізацыі літаратурных жаночых вобразаў у работах сучасных даследчыкаў // Журнал Вестник Полоцкого гос. ун-та. Серия А : Гуманитарные науки. 2018. № 10. С. 25–32.

**Чарнавокая Ю. М. (Мінск)**

## Вобраз салдата ў сацыяльна-бытавых казках беларусаў

Сацыяльна-бытавымі называюць казкі, у якіх «праўдзіва, часцей за ўсё ў крытычна-завостранай форме, адлюстроўваюцца грамадскія і сацыяльныя з’явы, быт, жыццё людзей, высмейваюцца сацыяльныя тыпы, людскія недахопы, сцвярджаюцца народныя ідэалы» [4, с. 4]. Адным з характэрных, адметных сваёй функыянальнасцю персанажаў сацыяльна-бытавых казак з’яўляецца салдат (жаўнер, рэкрут, служывы («служывенькі»)), між тым спецыяльнага даследавання яго семантыкі і функцыянальнасці не было праведзена да гэтага часу. Матэрыялам для аналізу паслужылі тэксты са зборніка «Сацыяльна-бытавыя казкі» [4].

Салдат – персанаж беларускага фальклору, вайсковая служба якога супрацьпастаўлена сялянскай працы і ляжыць у аснове суаднясення яго з іншасветам і надзялення звышнатуральнымі здольнасцямі [2, с. 423].

Характарызуючы фальклорны вобраз салдата, неабходна мець на ўвазе, што ў Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай, у склад якіх уваходзіла Беларусь, рэкруцкая павіннасць адсутнічала (у Расіі прымусовыя рэкруцкія наборы былі ўведзены ў канцы XVII − пачатку XVIII стагоддзя). Вайсковую службу неслі пераважна людзі, якія мелі адносіны да вышэйшых груп сялян-слуг, што пазней увайшлі ў склад шляхецкага саслоўя. Першы рэкруцкі набор у Беларусі быў праведзены ў 1794 г. Названы гістарычны факт паспрыяў таму, што ўсіх рэкрутаў на тэрыторыі Беларусі лічылі «чужакамі», часта называлі «маскалямі», што знайшло праламленне ў некаторых казачных сюжэтах: *…Толькі ось зірнула яна ў бок, аж на яе кабылцы едзе якісь чалавек. Прыглядаецца яна, аж гэта сусед маскаль. Хадзіў ён у лес з сякерамі, ці не трапіцца знадобная дзераўляка, натрапіў на кабылку да давай гукаць, зваць гаспадара, але не дагукаўся... «Мабыць, зладзеі, – думае маскаль, – укралі кабылку суседа з драбінкамі да й схавалі яе ў лесе»* [4, с. 402]; *Ішоў адзін хлопец з маскалёў дай зайшоў да карчмы нанач* [4, с. 409].

Паколькі сацыяльна-бытавая казка адрозніваецца ад іншых перш за ўсё спецыфікай яе фантастыкі (напрыклад, чарадзейнай казцы характэрна наяўнасць звышнатуральных сіл: страшыдлаў, пачвар, розных чарадзейных істот і прадметаў, што звычайна адсутнічае ў сацыяльна-бытавой казцы), адпаведна, канфлікты і калізіі ў іх будуць розныя [4, с. 5], што наўпрост уплывае на выяўленне вобраза салдата, яго функцыянавання: калі ў чарадзейных казках вобраз салдата надзяляецца разнастайнымі функцыямі (персанаж можа быць прадстаўніком адмоўных сіл, быць трыкстэрам ці нават выконваць функцыю чароўнага прадмета), то ў сацыяльна-бытавых казках вобраз салдата не надзяляецца звышнатуральнай сілай, але здольны перамагчы ворагаў дзякуючы мудрасці, кемлівасці, дасціпнасці, знаходлівасці або ў выніку ўдачы. Так, у казцы «Старое сядло» [4, с. 374] салдат Іван, з якога ў вёсцы ўсе кпілі, выкарыстаў сваю знаходлівасць і хітрасць, за добрую службу атрымаў паводле царскага распараджэння маёнтак ад свайго пана: *Цар жа не знаў, што гэта значыць старое сядло, узяў напісаў запісачку, што па волі яго вялічаства пан Азанчэўскі должан аддаць Пятрову Івану Старое Сядло са ўсімі прынадлежнасцямі. І на гэтым разгавор з царом закончыўся. Іван палучыў запіску і адправіўся дамой. Цару было смешна: мужык дурны дурное любіць. Ён жа не знаў, што ў пана Азанчэўскага ёсць іменне, каторае называецца «Старое Сядло». Мужык прыходзіць дамой і прама к пану, прад'яўляець гэту запіску, дзе было напісана, што па волі яго вялічаства вы далжны аддаць Івану Старое Сядло. У пана было іменне не адно. Ён выехаў з гэтага і перадаў яго Пятрову Івану* [4, с. 375]. Аналізуючы змест

названай казкі, можна зрабіць выснову, што твор адносіцца да пазнейшага часу, бо гаворка ў тэксце ідзе не пра дваццаць пяць гадоў службы, а толькі пра пяць: *Адзін мужык Іван адслужыў цару салдатам пяць лет. Служыў верна цару-бацюшку, а самаго цара і не відзеў* [4, с. 374].

У казцы «Дурныя людзі» [4, с. 161] салдат, прымяніўшы свае веды, дапамог мужыкам зручна паабедаць, накарміць вала, «напусціць у хату сонца» (прасекчы ў хаце вокны), зарэзаць барана. З дапамогай хітрасці зарабіў грошай і ўцёк ад пагоні. Прыйшоўшы дахаты, разумны салдат правучыў сварлівую цешчу і цесця: *«І дзе ты столькі грошай набраў?» А салдат кажаць: «Гэта я авёс малоў, кісель варыў, у кашэль ліў і на рынку прадаваў, – во і зарабіў грошы!» Стала бабе завідна. Намалола яна аўса, наварыла кісяля і кажа дзеду: «На, дзед, нясі на рынак прадаваць». Дзед завязаў кісель за плечы, а баба кажаць: «Глядзі ж ты, дзед, грошы не прапі, усё ў двор прынясі!» Узяла дзеда жаль. Стаў ён на калені і кажаць: «Каб я счарнеў, калі грошы прап'ю!» Пакланіўся ў зямлю, а кісель увесь і выцек дзеду на лысіну* [4, с. 164]. Салдат ў творы выяўляецца кемлівым, хітрым, знаходлівым, надзяляецца ведамі, недаступнымі для іншых сялян.

Аналагічна трактуецца вобраз салдата і ў казцы «Як хлопец дзеўку к рабоце прыламіў» [4, с. 190]: дзякуючы знаходлівасці, хлопец прывучыў да працы сваю маладую жонку і яе маці.

Варта ўсё ж адзначыць, што як і ў чарадзейных, у сацыяльна-бытавых казках сустракаецца вобраз салдата «несвабоднага», які выступае толькі памочнікам і разглядаецца «як персаніфіцыраваная здольнасць героя» [3], з'яўляецца паказчыкам сілы іншых персанажаў. Часта як асобны чалавек у такіх выпадках салдат не разглядаецца, успрымаецца ў складзе абагуленага войска: *Малады сінат здзелаў пагоню, распусціў сем палкоў салдат яе іскаць і сам іскаў, но не нашоў* [4, с. 382]; *Ета цару стала совесна, што ўсякі яму смяецца. Ну, тады цар назначыў двох жандараў ці салдатаў і даў ім вадзіць казла* [4, с. 70]; *…Жывуць разбойнікі ціха і не чакаюць ліха. А тут паны ды начальства сагналі людзей са ўсяе акругі, прыгналі маскалёў да казакоў. Акружылі тыя ўвесь оступ да давай калаціць* [4, с. 405]. Як сведчыць апошняя цытата, як і *маскаль*, *казак* у такім кантэксце выступае часткай войска, якое супрацьстаіць вяскоўцам, з'яўляецца тоесным вобразу служывага.

Як адмысловы пасрэднік паміж царэўнай і падманутымі старцамі з'яўляецца салдат у казцы «Аб убогіх старцах, як іх мазурык надуў»: *Салдат далажыў царэўне: «Прыйшлі нейкія ўбогія вашага атца памінаць, а ён яшчэ добр-здароў і царствам вірадуіт»* [4, с. 118]. У такіх

выпадках салдат таксама ўспрымаецца як «несвабодны» персанаж – самастойна прадпрымаць якія-небудзь дзеянні ён не можа.

Казка «Салдацкі “Отчэ наш”» [4, с. 201] выступае своеасаблівым выключэннем: салдат з’яўляецца «несвабодным», але сваім адказам ставіць у тупік генерала. Генерал загадвае салдату прачытаць малітву «Отчэ наш». Загад не ігнаруецца, бо аслухацца ў войску нельга, але выконваецца ў наступнай жартаўліва-іранічнай форме: *Кагда салдат у устрой ступае, ён цяжка ўздыхае і гаворыць: «Отчэ наш». Румяна зара па небе іграе, рота камандзіра ажыдае, стучыць, гручыць, з дасады рвецца, страшны гром раздаецца – яко на небесі. У чом жа мы цябе правінілісь, на службу не явілісь ілі ў кабак шаталісь, – даш нам днесь. Што нам ад казны палагаецца, вы далжны нам аддаць, а еслі будзеце красці і ў свой карман класці, будзеце далжніком нашым, – не ўвядзі нас ва іскушэнне, но ізбаві нас, як і мы ізбаўляемся ад цябе, ад лукавага* [4, с. 202].

Тое ж можна сказаць і пра казку «Салдат у касцёле» [4, с. 202]. Дзякуючы сваёй знаходлівасці, салдат выкручваецца з цяжкай сітуацыі і апраўдваецца перад ротным камандзірам: *«Как ты, сукін сын, імеў права ва ўрэмя бажэствэнных малітваў вынуць калоду карт? Што ў іх абазначаецца, у гэтых картах?» «Ваша благародзіе, ведзь карт я не купляў у магазіне, для якога-небудзь пабальства або для ігры ў грошы, карты даны мне маімі радзіцелямі, кагда я ішоў у салдаты, для апазнання бога». «Какой можа быць бог, машэннік, у картах, што ты тут маніш?» «Вот вы слушайце, не сярчайце, я вам раскажу. У нас у поўнай калодзе чатыры тузы, у нас састаіць свет з чатырох старон: север, юг, запад, васток…»* [4, с. 203]. Вынаходлівы салдат тлумачыць значэнне кожнай карты. Кемлівасць не падвяла салдата і тады, калі ўсе магчымыя варыянты скончылася, а карта адна засталася – салдат пры гэтым сумеў не толькі выйсці пераможцам, але яшчэ і абвінаваціць у сваіх непрыемнасцях старэйшага па званні: *«Ваша благародзіе, – узяўшы пікавага валета ў рукі, ударыў плячыма яго аб стол, – гэта той бяздзельнік-фельтфебель, каторы арыштаваў мяне і прыставіў к вашаму благародзію»* [4, с. 204].

Адметнай паводле структуры з’яўляецца «Казка пра Пятра Вялікага і салдата». У межах аднаго твора салдат выяўляецца і як «несвабодны» (у складзе войска), і як «свабодны» (Пётр адпусціў салдата за верную службу яшчэ і ўзнагародзіў: *Едзь дамоў, жаніся і жыві. А калі грошай у цябе не стане, то напішы мне пісьмо, – я табе яшчэ прышлю* [4, с. 85]). Як і ў большасці казак, салдат-герой можа рэалізаваць свае патэнцыі толькі ва ўмовах свабоды, калі ён здольны самастойна дзейнічаць. У такіх абставінах салдат праяўляе сваю кемлівасць, ратуе

жыццё сабе і Пятру Вялікаму: *Стаў старэйшы разбойнік пасылаць па чарзе на чардак сваіх таварышаў, а салдат усім і паздымаў галовы. Тады старэйшы разбойнік палез сам. Салдат і яму адсек галаву. ...Вось ужо раніца. Пятро-салдат будзіць Пятра Вялікага. Устаў Пётр Вялікі, стаў злазіць, падышоў да дзверцаў, бачыць – галовы. «Што гэта такое?» «Калі б я заснуў, дык нашы б галовы вось так ляжалі б», – адказаў салдат* [4, с. 86]. Казачнасць сюжэта выяўляецца, акрамя іншага, і ў фінале, дзе салдат сам становіцца царом: *Тады Пётр Вялікі і кажа салдату: «Ну, цяпер будзеш маім наследнікам». Пятро-салдат узяў і матку да Пятра Вялікага, і сталі яны пажываць, і жылі датуль, пакуль Пётр Вялікі не памёр. Тады ўступіў на прыстол Пятро-салдат* [4, с. 86].

Адмысловым усечаным варыянтам вышэй прааналізаванага твора з'яўляецца казка «Як салдат з арміі ішоў» [4, с. 86]. У ёй адсутнічае частка пра «несвабоднага» салдата, усе дзеянні адбываюцца па дарозе дамоў. Гэтак жа, як і ў папярэднім тэксце, салдат разам з царом спыняюцца на начлег, дзе і сустракаюцца з разбойнікамі. Адважны і кемлівы салдат ратуе жыццё сабе і цару, за што і атрымлівае ўзнагароду: *Салдат набраў поўныя кішэні грошай і паехалі яны дахаты. Пад'язджаюць яны да горада, і цар гаворыць на салдата: «Ты ідзі, а я паеду ў горад». Цар заказаў музыку, а сам пайшоў сустракаць салдата. Сустрэўшы салдата, цар сказаў: «За тваю храбрасць будзеш намеснікам у мяне»* [4, с. 87].

Такім чынам, уяўленні пра «выключанасць» вайскоўца з традыцыйнага быту і пра валоданне ім асаблівымі ведамі і ўменнямі грунтаваліся на адметнасцях воінскай службы XVIII–XIX стст. (небяспечная дзейнасць, працяглы тэрмін, знаходжанне ў чужым асяродку, адарванасць ад сям'і, звыклых для селяніна заняткаў і г. д.). Выжыць у такіх умовах было складана, таму галоўныя рысы вобраза салдата ў казках – хітрасць, знаходлівасць, выкрутлівасць, кемлівасць. Салдат атрымлівае верх не толькі над дэманамі, але і над прадстаўнікамі дзяржаўнай улады (цар, генерал, пан) і сацыяльнымі аўтарытэтамі (поп, дзяк, купцы, свякроў), выходзіць пераможцам са складаных сітуацый.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Белова О. В. Свой – чужой // Славянская мифология : энцикл. слов. / редкол. С. М. Толстая [и др.]. Изд. 2-е. М. : Междунар. отношения, 2011. С. 425–426.

2. Дучыц Л., Лобач У. Салдат // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. Мінск, 2011. С. 423–424.

3. Новик Е. С. Система персонажей русской волшебной сказки // RUTHENIA [Электронный ресурс]. 1999. Режим доступа : http://www.ruthenia.ru/folklore/novik8.htm . Дата доступа : 21.01.15.

4. Сацыяльна-бытавыя казкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад. А. С. Фядосік , рэд. выд. В. К. Бандарчык. Мінск : Навука і тэхніка, 1976. 520 с.

**Черевач А. Е. (Минск)**

## Формирование у учащихся стратегий коммуникативного поведения как аспект обучения иностранному языку

Подготовка к межкультурной коммуникации предполагает обучение сознательному выбору учащимися адекватных средств общения, что невозможно без знания норм и правил коммуникативного поведения людей, говорящих на разных языках и представляющих разные культуры. Так как «за одними и теми же типами речевых высказываний в разных языках могут стоять различные речевые замыслы» [2, с. 8], учащимся важно иметь четкое представление о национально-культурной специфике вербального и сопровождающего его невербального поведения личности или группы лиц в процессе общения, типичного для представителей других лингвокультур.

К национально-специфическим факторам, отражающимся в нормах коммуникативного поведения, относятся менталитет, национальный характер, коммуникативные ценности народа. Отражение этих факторов в коммуникативном поведении позволяет выделить его доминантные черты, знание которых определяет выбор комплекса речевых и сопровождающих их неречевых действий, направленных на достижение коммуникативной цели и называемых коммуникативной стратегией [3].

Неумение выбрать в общении коммуникативную стратегию, адекватную общекультурным, ситуативным, групповым и индивидуальным нормам коммуникативного поведения собеседника, может стать причиной возникновения коммуникативных неудач, привести к прекращению коммуникации и даже возникновению конфликтов между представителями разных культур. В связи с этим в процессе обучения иностранному языку как средству межкультурной коммуникации необходимо целенаправленно формировать у учащихся стратегии иноязычного коммуникативного поведения.

В учреждениях среднего образования формирование коммуникативных стратегий как аспект обучения иностранному языку приобретает особую актуальность в старших классах, где закладываются основы профессионально-личностного межкультурного общения. От современного специалиста требуется умение работать в группе (команде), непредвзято выражать свои мнения и оценки, быть готовым к совместной деятельности с людьми различных взглядов независимо